Навагроскі, Т.А. Выданне «Беларусы» і яго ўклад у этналагічнае вывучэнне Беларусі / Т.А. Навагродскі // Працы гістарычнага факультэта : навук. зб. Вып. 1 / рэдкал. : У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БДУ, 2006. — С. 171–174.

***Т. А. НАВАГРОДСКІ***

# ВЫДАННЕ «БЕЛАРУСЫ» І ЯГО ЎКЛАД У ЭТНАЛАГІЧНАЕ ВЫВУЧЭННЕ БЕЛАРУСІ

З 90-х гг. мінулага стагоддзя беларускія этнолагі распачалі велізарную работу па стварэнні абагульняючай працы пад назвай «Беларусы». Гэта першая шматтомная этналагічная праца аб беларускім народзе, яго традыцыях. Адна з важнейшых задач гэтага выдання — паказаць багатыя шматвяковыя традыцыі беларускага народа ў гаспадарцы, рамёствах, дойлідстве, кулінарыі, аддзенні, сям’і, рэлігіі і іншых сферах этнічнай культуры. Першапачаткова планавалася падрыхтаваць восем асобных тамоў, але ў ходзе работы было прынята рэдкалегіяй рашэнне павялічыць колькасць тамоў да 14.

Першы том гэтага выдання быў выдадзены ў 1995 г. пад назвай «Прамысловыя і рамесныя заняткі». Ён адлюстроўвае характар і асаблівасці традыцыйных беларускіх промыслаў і рамёстваў. У ім падрабязна прааналіза-



ваны здабыўныя промыслы (збіральніцтва, рыбалоўства, паляўніцтва, пчалярства, лясныя і лесахімічныя промыслы) і рамёствы (ткацтва, вышыўка, кавальства, дрэваапрацоўка, ганчарства, пляценне, скураныя рамёствы), паказана развіццё промыслаў і рамёстваў ад старажытных часоў да другой паловы XX ст., падкрэсліваецца іх роля і месца ў жыцці беларусаў. Том змяшчае 165 ілюстрацый, якія даюць нагляднае ўяўленне аб апісаных прадметах. Аўтары працы на працягу многіх гадоў і нават дзесяцігоддзяў займаліся вывучэннем асобных промыслаў і рамёстваў. Напрыклад, ткацтва актыўна вывучала Г. М. Курыловіч, дрэваапрацоўку — В. С. Цітоў, вышыўку — В. Я. Фадзеева, здабыўныя промыслы — С. Ф. Цярохін, ганчарства і кавальства — Я. М. Сахута, лясныя і лесахімічныя промыслы, кушнерства, гарбарства і інш. — Н. І. Буракоўская. У навуковы ўжытак у дадзеным томе ўведзена многа палявога этнаграфічнага матэрыялу, сабранага аўтарамі ў час экспедыцый ва ўсе рэгіёны Беларусі.

Аўтарам другога тома працы «Дойлідства», выдадзенага ў 1997 г., з’яўляецца вядомы спецыяліст у галіне вывучэння нацыянальнай архітэктуры А. І. Лакотка. Упершыню ў дадзенай працы аналізуецца эвалюцыя беларускай архітэктуры на працягу амаль цэлага стагоддзя. Аўтар глыбока характарызуе асяроддзе жыцця і тыпы паселішчаў, сакральныя, абарончыя, жылыя і гаспадарчыя збудаванні. Даследчык ажыццявіў комплексны аналіз праблемы з улікам дасягненняў яе вывучэння ў этналогіі, археалогіі, архітэктуразнаўстве і мастацтвазнаўстве. А. І. Лакотка разглядае дойлідства як адзін з галоўных аб’ектаў гістарычнага працэсу фарміравання асяроддзя пражывання этнасу. Гэта дало даследчыку магчымасць выдзеліць шмат новых этнаграфічных прыкмет, рэгіянальных і лакальных асаблівасцей матэрыяльнай культуры беларусаў. Для напісання тома аўтар выкарыстаў археалагічныя крыніцы, дзённікі паслоў, чыноўнікаў і падарожнікаў, этнаграфічныя краязнаўчыя і гісторыка-статыстычныя апісанні гарадоў і вёсак XIX ст., шматлікую літаратуру па архітэктуры, а таксама багацейшыя палявыя матэрыялы. Том вызначаецца мноствам каштоўнага матэрыялу. Праца ўяўляе сабой фундаментальнае даследаванне аднаго з элементаў культуры этнасу — дойлідства.

Трэці том прысвечаны гісторыі этналагічнага вывучэння Беларусі. Ён быў выдадзены ў 1999 г., аўтарам яго з’яўляецца В. К. Бандарчык. У аснову трэцяга тома пакладзены тры працы аўтара, выдадзеныя ў 60—70 гг. XX ст. Больш канкрэтнага фактычнага матэрыялу ў томе змешчана па беларускай этнаграфіі XIX ст., а XX ст., асабліва другая яго палова, паказана бегла, аднабакова. Аўтар аналізуе толькі працы, напісаныя супрацоўнікамі аддзела этналогіі (ды і то далёка не ўсе), і зусім выпадаюць з-пад яго ўвагі работы



беларускіх этнолагаў — супрацоўнікаў кафедр вну, музеяў і інш. В. К. Бандарчык па-ранейшаму выкарыстоўвае класавы падыход, з улікам якога і дае характарыстыкі дзейнасці тых ці іншых этнографаў.

Праблемы этнагенезу і этнічнай гісторыі даследуюць аўтары чацвёртага тома «Вытокі і этнічнае развіццё», выдадзенага ў 2001 г. Том прысвечаны навуковаму аналізу праблем паходжання і этнічнага развіцця беларускага народа, яго вытокаў, каранёў, змен, якія адбываліся ў яго культуры на працягу стагоддзяў. У ім паказаны этнічныя асаблівасці беларускага народа, яго культурныя сувязі з іншымі народамі, сучасны стан і шляхі далейшага развіцця. Чацвёрты том змяшчае звыш 100 фотаздымкаў.

Вывучэнню беларускай сям’і прысвечаны пяты том. Ён з’яўляецца грунтоўным даследаваннем сям’і беларускага этнасу, яе ўкладу жыцця, традыцый выхавання, абрадаў. У працы аналізуецца дынаміка

структуры сям'і, унутрысямейных адносін, матэрыяльнага забеспячэння, жыллёвых і санітарных умоў. Формы і тыпы сям'і вызначаны на аснове колькасці шлюбных пар і пакаленняў, а таксама сваяцтва. Цікава і ўсебакова прааналізавана педагагічная спадчына беларускай сям'і. Справядліва адзначана, што самым важным спосабам выхавання дзяцей з'яўляецца іх удзел у гаспадарчых работах, у святах, абрадах, занятках музыкай і іншымі відамі мастацтва. Паказана вялікая роля роднай мовы, фальклору. У томе падрабязна разгледжаны таксама сямейныя абрады: вясельныя, радзінныя і пахавальна-памінальныя. Том змяшчае звыш сямідзесяці фотаздымкаў, якія даюць нагляднае ўяўленне пра яго змест. Неабходна адзначыць, што ў дадзенай кнізе ўпершыню ўведзены ў навуковы ўжытак вялікі фактычны матэрыял пра беларускую сям'ю, сабраны аўтарамі (Г. М. Курыловіч, Л. В. Ракава, Т. І. Кухаронак) у час шматлікіх этнаграфічных экспедыцый па Беларусі. Разам з тым у працы не разгледжана гарадская сям'я, сям'я прывілеяваных саслоўяў (мяшчан, шляхты, духавенства), неналежным чынам прасочана гісторыя сям'і на Беларусі.

Апошні выдадзены на дадзены час шосты том змяшчае даследаванні грамадскіх традыцый. У ім разгледжана сістэма грамадскіх традыцый беларусаў, фарміраванне і эвалюцыя традыцыйных форм сацыяльнай арганізацыі, прававой культуры, грамадскіх форм выкарыстання вольнага часу, разнастайных святочных традыцый: хрысціянскіх, каляндарных, прафесійных, дзяржаўных. У дадзенай працы структурны падыход удала спалучаецца з удасканаленым эвалюцыйным, што дало магчымасць прасачыць трансфармацыю сістэмы грамадскіх традыцый беларускага этнасу з сярэдніх вякоў да канца XX ст. Праца напісана на аснове архіўных крыніц, апублікаваных дакументаў, багатых палявых этнаграфічных матэрыялаў. Шырока выкары-



станы таксама статыстычныя дадзеныя, фальклорныя тэксты. Том змяшчае 119 ілюстрацый.

Вядзецца праца па падрыхтоўцы тамоў па фальклоры, аддзенні, кулінарыі, гаспадарчых занятках і інш.

Шматтомнае выданне «Беларусы» ў цэлым адлюстроўвае стан акадэмічнай этнаграфічнай навукі. Абагульняючыя працы па розных аспектах этнічнай культуры даюць уяўленне, наколькі добра яны вывучаны, што неабходна яшчэ зрабіць. Напрыклад, пытанне дойлідства на сённяшні дзень вывучана грунтоўна, а вось такая важнейшая праблема, як гістарыяграфія этнаграфіі, патрабуе велізарнай працы беларускіх этнолагаў, каб стварыць цэласную і аб'ектыўную гісторыю беларускай этналогіі.